

# БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

**Апошняя субота перад V Усебеларускім народным сходам для ўладнай вертыкалі краіны была не проста працоўнай: яна прайшла ў фармаце прамога кантакту з тымі, для каго ўлада працуе — з простымі людзьмі. Сем «прамых ліній» з кіраўнікамі рэгіёнаў і сталіцы, сотні званкоў, дзясяткі размоў без пасярэднікаў, і па кожнай — канкрэтныя даручэнні, за кожнай — тое, што хвалюе людзей, а значыць, не павінна пакідаць абыякавым і чыноўнікаў. Пра што людзі прасілі, паведамлялі і што прапаноўвалі — у матэрыялах нашых карэспандэнтаў.**

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ — САМАЕ АКТУАЛЬНАЕ

**Нягледзячы на лета, суботу, водпускі і лецішчы, многія мінчане не захацелі прапусціць магчымасць асабіста пагутарыць з мэрам свайго горада. На «прамую лінію» да старшыні Мінгарвыканкама за тры гадзіны было зафіксавана каля 3000 спроб дазвону. Змаглі датэлефанавацца 58 чалавек, з 19 з іх пагутарыў асабіста старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ, 39 былі перанакіраваны ў раённыя адміністрацыі.**

Адзін з тых, хто дазваніўся на «прамую лінію», Валерый Антонавіч, расказаў, што яго сям'я з 9 чалавек жыла ў прыватным доме ў Грушаўцы. У 1984 годзе ім далі тры кватэры. Цяпер мінчанін спрабуе даказаць, што ім палажана бязвыплатная прыватызацыя. «Разбярыцеся з гэтым, калі ласка», — папрасіў ён мэра... Былі і іншыя званкі, звязаныя з праблемамі прыватызацыі. Тэма гэтая вострая стаіць для часткі нашых сугарамадзян, якія хочуць паспець прыватызаваць сваё жыллё.

Але мінчане на «прамой лініі» расказвалі не толькі пра свае асабістыя праблемы — небайкавыя жыхары сталіцы хацелі палепшыць жыццё ў горадзе ў цэлым. У сваіх званках яны закранулі пытанні гандлёвага абслугоўвання і несанкцыянаванага гандлю, працы грамадскага транспарту, добраўпарадкавання сталічных зон адпачынку, праблемы, звязаныя з паркоўкай аўтамабіляў у дварах і многія іншыя. Усе звароты былі ўзятыя на кантроль.

Разам з тым, як паведаміў Андрэй Шорац, усё больш праблемных пытанняў вырашаецца раённымі адміністрацыямі горада. «Узімку мінулага года колькасць тых, хто званіў на «прамую лінію», была ў разы большай, першыя месяцы рэгістравалася каля 27 тысяч спробаў дазвону. Розніца відавочная. Усё гэта сведчыць, у тым ліку, аб памяншэнні колькасці праблемных пытанняў», — сказаў старшыня Мінгарвыканкама. І дадаў, што раней часцей гучалі тэмы ЖКГ, добраўпарадкавання. Цяпер жа большасць такіх пытанняў вырашаецца на ўзроўні службы 115.бел, якая пачала працаваць у Мінску ў лістападзе мінулага года.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

## АЎТОБУСНЫ ПРЫПЫНАК УЛАДКУЮЦЬ

**На «прамую лінію» да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатолія ЛІСА дазваніліся 29 жыхароў вобласці. Пытанняў было нашмат больш, бо асобныя грамадзяне агучвалі адразу некалькі праблем. На некаторыя пытанні губернатар адказваў адразу, іншыя былі аформлены ў даручэнні службовым асобам, бо патрабуюць дадатковага вывучэння.**

Званок з вёскі Роўбіцк Пружанскага раёна датычыў транспартнага абслугоўвання. Побач з указаным населеным пунктам праходзіць новая аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы. Па дарозе зараз курсіруе аўтобус Гродна — Брэст, чаму жыхары вёскі вельмі рады. Ёсць прыпыначны пункт, на якім аўтобус спыняецца. Ды гэтае месца абазначана толькі знакам: ні павільёна, ні лавачкі для пасажыраў няма. Магчыма, пры праектаванні дарогі пункт пазначылі як прыпынак па запатрабаванні. Але цяпер трэба пайсці насустрач жыхарам вялікай вёскі, адзначыў губернатар, і даручыў дарожнікам вырашыць пытанне з установкай хацяб невялікага павільёна. Людзі не павінны ў дождж ці снег чакаць аўтобус у чыстым полі.

Прадпрымальнік з Брэста, які аказвае паслугі па перавозцы пасажыраў, узняў пытанне стварэння роўных умоў для розных фірмаў, якія працуюць у гэтай галіне.

Нечакана для кіраўніка вобласці і для многіх прысутных на «прамую лінію» паступіла аж два звароты пра адстрэл бадзяжных жывёл у населеных пунктах сярод белага дня. На гэты конт службовыя асобы атрымалі строгае ўказанне разабрацца аператыўна. Ніхто не мае права прымяняць агнястрэльную зброю ў гарадах і вёсках для знішчэння жывёл.

З вёскі Струга Столінскага раёна патэлефанавала Алена Белавус. Ад імя гаспадароў прысядзібных сотак жанчына прасіла не закрываць іх ветэрынарны ўчастак. Старшыня аблвыканкама адразу абнадзеіў гаспадыню, што ў іх вёсцы абавязкова застанецца адна штатная адзінка хай сабе і раённай ветстанцыі.

І калі прыведзеныя вышэй прыклады зваротаў датычыліся калектыўнага інтарэсу, то былі і асабістыя просьбы. Але пытанні, якія ўзнімалі людзі, надзвычай важныя для іх. Так, жыхарка Брэста расказала пра сваю сястру, інваліда другой групы, якая тры разы на тыдзень мусіць праходзіць працэдуру гемадыялізу. Апошні год жанчына не ходзіць, бо атрымала пераломы. Інвалідная каляска ў звычайны аўтамабіль не змяшчаецца. І яны карыстаюцца сацыяльным таксі. Але ў горадзе ёсць толькі адна машына такога прызначэння, і тая часта ламаецца. Да таго ж кошт паслугі для інвалідаў значны, за тыдзень даводзіцца плаціць па 240 тысяч рублёў, і кожны дзень перажываць, каб заўтра машына прыйшла, а не стала на рамонт.

Кіраўнік вобласці даў даручэнне ўпраўленню аховы здароўя пераабсталяваць адну з машын хуткай дапамогі альбо набыць новую для перавозкі падобных пацыентаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ЯК БЕЗ ЛІФТА НА 9-ты ПАВЕРХ?

**«Трэба ўявіць сябе на месцы людзей, якія абгрунтавана звяртаюцца да ўлады па дапамогу», — з такім заклікам да адказных асоб звярнуўся губернатар Віцебшчыны падчас «прамой лініі». Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ за больш чым тры гадзіны выслухаў прыблізна 25 чалавек.**

Аднаму, дарэчы, праз тэхнічныя праблемы (размова па тэлефоне «зрывалася») удалося выйсці на сувязь 3 разы. Настойлівы пенсіянер, які жыве ў прыгарадзе Віцебска, абураўся, чаму ў дзяржаўнай паліклініцы трэба плаціць за стаматалагічныя паслугі. Тым больш што памер пенсіі невялікі. Губернатар даручыў разабрацца.

Па традыцыі вельмі шмат званкоў было па тэме ЖКГ. Мужчына скардзіўся на слабы напор вады ў шматпавярховым доме. Паступіў сігнал пра тое, што ў 9-павярховым доме яшчэ ў сакавіку адключылі ліфт, які абяцалі запусціць да 9 мая, але абяцанне не выканана дагэтуль. Жыхар глыбінкі прасіў разабрацца, ці правільна падлічаны кошт паслуг за пракладку газавай трубы да яго дома, з улікам таго, што ён сам выкапаў траншэю і выканаў іншыя падрыхтоўчыя работы. З Оршы пазваніў ахоўнік арганізацыі, якая займаецца вывазам смецця, і паведаміў, што яго начальнік патрабаваў пяць бутэлек каньяку і намякнуў на іншую «матэрыяльную ўдзячнасць» за магчымы працяг працоўных адносін... Скардзіліся і на несвоечасовыя выплаты: за здадзенае малако, заробкі і па лісце часовай непрацаздольнасці.

Аналізуючы апошнія «прамыя лініі», Мікалай Шарстнёў падкрэсліў, што выканкамам трэба працаваць на апярэджанне зваротаў. Калі будуць своечасова выяўляць праблемы, вырашаць іх, званкоў ад людзей стане менш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ПАЎТОРНЫХ ЗВАРОТАЎ НЕ БЫЛО

**Адсутнасць паўторных зваротаў на «прамую лінію» сведчыць пра няўхільнае выкананне абяцанняў, адзначыў падчас прамой тэлефоннай лініі ў мінулую суботу старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК. Дарэчы, назіраецца тэндэнцыя зніжэння і агульнай колькасці званкоў. Кардынальна змянілася тэматыка праблем, якія ўзнімаюцца людзьмі:**

— Людзі ўжо не звяртаюцца з пытаннямі, да рашэння якіх часам было нават складана падступіцца. Сур'ёзных праблем не прагучала, а бывае нават, што чалавек проста хоча выказаць сваю думку. Мне кожны раз цікава не толькі паслухаць людзей, але і адчуць, што хвалюе вобласць у цэлым, кожны раён паасобку.

Усяго на прамую тэлефонную лінію ў Гомельскі аблвыканкам паступіла 88 зваротаў. Да сур'ёзных праблем зараз можна аднесці якасць дарог у сельскіх населеных пунктах. Шматлікія звароты грамадзян на гэтую тэму далі штуршок да прыняцця ў вобласці кардынальнага рашэння. Сельскія дарогі з камунальнай гаспадаркі перададзены на баланс дарожных службаў. Сітуацыя паступова стала выпраўляцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## ЖКГ, ЖЫЛЛЁ, РАБОТА...

**Перад пачаткам суботняй прамой тэлефоннай лініі з жыхарамі вобласці старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ абмяркоўваў з адпаведнымі службовымі асобамі сітуацыю, што склалася ў выніку прыроднага катаклізму.**

У пятніцу навальніца з моцным ветрам «разгулялася» ў дзевяці раёнах Гродзеншчыны. Згодна з інфармацыяй абласнога ўпраўлення МНС, былі пашкоджаны дахі 44 жылых дамоў, 36 сельскагаспадарчых і 9 адміністрацыйных будынкаў, трансфарматарнай падстанцыі, абясточана 170 населеных пунктаў. Зарэгістравана 126 паведамленняў аб падзенні дрэў на праезныя часткі, жылыя дамы і лініі электраперадач, у абласным цэнтры яны пашкодзілі 14 легкавых аўтамабіляў. З-за галін, што ўпалі на чыгуначныя пуці, адбылася затрымка руху чатырох цягнікоў на станцыі Гродна. З пераломам галёнкі ў бальніцу даставілі жанчыну, якая пацярпела ад падзення ліста шыферу.

Уладзіміру Краўцову патэлефанаваў на «прамую лінію» мужчына з садоўніцкага таварыства Чэхаўшчызна ў Гродзенскім раёне. Ён прыехаў з унукамі на дачу, а дом абясточаны.

Усяго на гэтую «прамую лінію» паступіла 112 званкоў. Як правіла, людзі адразу ж атрымлівалі тлумачэнні ад спецыялістаў тых ці іншых службаў, праверку шэрагу зваротаў узялі на кантроль. А ў некаторых выпадках спатрэбіліся даручэнні старшыні аблвыканкама. У прыватнасці, па сітуацыі на вуліцы Альшымаўскай у Ваўкавыску, дзе няма вады: трубаправод летась праклалі, але работы па яго падводзе да прыватных дамоў прыпынены. Да таго ж не завяршылі добраўпарадкаванне тэрыторыі, і ў дрэннае надвор'е яна становіцца цяжкапраходнай.

Дарэчы, на «прамую лінію» ў аблвыканкам цяпер тэлефануюць значна менш, чым напачатку ўводу ў практыку гэтай формы дыялогу ўлады з насельніцтвам.

Што тычыцца характару зваротаў, то ён фактычна не мяняецца — гэта ўжо традыцыйныя пытанні, звязаныя з жыллёва-камунальнай гаспадаркай: утрыманне, капітальны рамонт жылля, забяспечанасць вадой, цяплом, газам...

— Узнікаюць і новыя пытанні, у прыватнасці па жыллёвым будаўніцтве, — зазначыў Уладзімір Краўцоў. — У мінулыя гады існавалі праграмы з вялікімі аб'ёмамі сродкаў дзяржаўнай падтрымкі для пэўных катэгорый грамадзян. Сёння такія сродкі абмежаваны, і ўзнікае шмат пытанняў.

Пільнай увагі ўлады патрабуе і сітуацыя на рынку працы.

— У эканоміцы цяпер адбываюцца даволі складаныя працэсы, у шэрагу рэгіёнаў ёсць напружанасць на рынку працы. Нямала людзей сёння шукаюць работу і, зразумела, звяртаюцца ў тым ліку і на «прамую лінію» ў аблвыканкам. Таму наша першачарговая задача — ствараць новыя прадпрыемствы, вытворчасці, рабочыя месцы, каб людзі мелі магчымасць працаваць, — лічыць Уладзімір Краўцоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

## ВЫСЛУХАЦЬ, ПАРАІЦЬ, ДАПАМАГЧЫ

**Чарговую прамую тэлефонную лінію правёў 18 чэрвеня старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ. Спектр пытанняў, з якімі звярталіся грамадзяне, вельмі шырокі і разнастайны — ад прыватызацыі жылля да рамонту дамоў, уладкавання дарог і цэнтралізаванага водазабеспячэння.**

Сустракаліся і праблемы, якія сапраўды вартыя ўмяшання зверху. У прыватнасці, Анатоль Сціпанавіч расказаў, што яго старэнькая маці жыве ў вёсцы Наваселле Мінскага раёна. З сакавіка ў яе доме працягваецца рамонт, камунальнікі цалкам разабралі дах. І не робяць нічога, каб закончыць работы. Падчас дажджу вада залівае кватэру, маёмасць, мэблю жыхароў. Акрамя таго, будаўнікі не прыбіраюць за сабой смецце.

— Літаральна з сённяшняга дня абяцаю падняць гэту тэму з тым, каб у вас завяршылі рамонт даху і навялі навокал парадак, — супакоіў заяўніка Іван Эдуардавіч.

Наталля Віктараўна з Салігорска паскардзілася, што ў яе доме па вуліцы Кастрычніцкай паверхам вышэй кватэру аддалі пад інтэрнат. Тут часта мяняюцца жыхары, вядуць яны сябе надта шумна. Могуць нават сярод ночы ўключыць пральную машыну. Словам, сям'я страціла спакой і сон. Жанчына звярталася ў райвыканкам, міліцыю. Яе разумеюць, але пытанне так і не вырашаецца.

Іван Ліпніцкі запэўніў, што накіруе просьбу ў пісьмовым выглядзе асабіста старшыні райвыканкама, каб той дапамог навесці парадак.

За тры гадзіны Іван Эдуардавіч выслухаў 52 жыхароў цэнтральнага рэгіёна. На 24 зваротах былі дадзены неабходныя тлумачэнні і кансультацыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ПАДЗЯЛІЛІСЯ НАБАЛЕЛЫМ

**Кожны другі, хто звярнуўся на суботнюю «прамую лінію» ў Магілёўскі аблвыканкам, быў пенсіянер. Жыхары Магілёўшчыны былі заклапочаны пытаннямі прыватызацыі, медыцынскага абслугоўвання, курортна-санаторнага аздараўлення, росту цэн, выплаты заробкаў... Весці «прыём» старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміру ДАМАНЕЎСКАМУ дапамагалі спецыялісты структурных падраздзяленняў аблвыканкама. Са старшынямі райвыканкамаў была арганізавана відэасувязь.**

Жыхарка Краснапольскага раёна папрасіла дапамогі ў працаўладкаванні. На выхаванні жанчыны непаўналетняе дзіця, а знайсці працу па яе спецыяльнасці (бібліятэкар) у раёне няма магчымасці. Яна згодна змяніць прафесію, але з вакансіямі складана.

Жыхарка вёскі Камінтэрн Магілёўскага раёна звярнулася з просьбай спрасціць выдачу даведак для насельніцтва, якое лішкі вырашчанай на сваім прысядзібным участку сельгаспрадукцыі прадае на рынку.

Уладзімір Аляксандравіч з Магілёва выступіў з прапановай прыдаць статус «дзеці вайны» ўсім тым, хто ў малалетнім узросце аказаўся на акупаванай тэрыторыі.

Некалькі пытанняў датычыліся выплаты заробкаў. Губернатар паабяцаў разабрацца па кожным канкрэтным выпадку. А таксама нагадаў адпаведным службам пракантраляваць выплату заробкаў да 21 чэрвеня.

Дапамога спатрэбілася жыхарцы Мсціслаўскага раёна. Яшчэ 9 гадоў таму яна купіла хату ў вёсцы Лютня, а прапісацца не можа. Той, хто прадаў ёй гэты дом, жыве ў Расіі і не спяшаецца ўрэгуляваць юрыдычныя моманты. Жанчыне між тым прыходзіцца плаціць за паслугі з двайным памеры.

Не менш складаная жыццёвая сітуацыя склалася ў магіляўчанкі. Жанчына не можа прыватызаваць кватэру з-за таго, што на яе метрах прапісаны сын, які адсутнічае болей за 20 гадоў. Сувязі з маці ён не падтрымлівае. Неабходна прайсці працэдуру прызнання яго памерлым, а тэрмін, адведзены насельніцтву для прыватызацыі жылля, падыходзіць да завяршэння. Між тым у жанчыны ёсць яшчэ дзеці, якім яна хацела б пакінуць спадчыну.

Усяго на суботнюю «прамую лінію» паступілі 22 звароты.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*